# ИСТОРИЯ
# HISTORY

УДК 94(474.5+476+477)“1352/1354”

**А. М. Лукашэвіч**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

## БАРАЦЬБА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА ЗА КІЕЎСКУЮ МІТРАПОЛІЮ: НЕКАНАНІЧНЫ МІТРАПАЛІТ ФЕАДАРЫТ (1352–1354 ГГ.)

У артыкуле даследуюцца малавядомыя ў беларускай гістарыяграфіі аспекты канфесійнай гісторыі, звязаныя са спробай пастаўлення на мітраполію Кіеўскую і ўсяе Русі кандыдата ад Вялікага Княства Літоўскага Феадарыта. Паказаны палітычны стан спраў на Русі і ў Візантыі, якія аказалі значны ўплыў на вырашэнне царкоўнага пытання. Адзначаецца, што стаўка вялікага князя літоўскага Альгерда на Феадарыта была першай спробай ажыццяўлення шырокага плана па дасягненні царкоўнай самастойнасці дзяржавы. Раскрываецца механізм некананічнага пастаўлення Феадарыта на мітраполію балгарскім (тырнаўскім) патрыярхам. Зроблена выснова, што гэтая спроба аказалася няўдалай з-за пэўнага збегу абставін (ініцыяцыя пытання яшчэ да смерці дзейснага мітрапаліта Феагноста, выкарыстанне некананічнага парадку пастаўлення на мітраполію, процідзеянне з боку Маскоўскага княства).

**Ключавыя словы**: Кіеўская мітраполія, Феадарыт, Альгерд, Феагност, Канстанцінопальскі патрыярхат, Вялікае Княства Літоўскае, праваслаўная царква.

**Для цытавання**: Лукашэвіч А. М. Барацьба Вялікага Княства Літоўскага за Кіеўскую мітраполію: некананічны мітрапаліт Феадарыт (1352–1354 гг.) // Труды БГТУ. Сер. 6, История, философия. 2023. № 2 (275). С. 5–11. DOI: 10.52065/2520-6885-2023-275-2-1.

**A. M. Lukashevich**
Belarusian State University

## THE STRUGGLE OF THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA FOR THE KYIV METROPOLY: THE NON-CANONICAL METROPOLITAN THEODORIT (1352–1354)

The article deals with aspects of confessional history, little known in Belarusian historiography, connected with an attempt to appoint Feodorit, a candidate from the Grand Duchy of Lithuania, to the Metropolis of Kyiv and All Rus'. The political state of affairs in Rus' and Byzantium is shown, which had a significant impact on the solution of the church issue. It is noted that the rate of the Grand Duke of Lithuania Olgerd on Theodoret was the first attempt to implement a broad plan to achieve church independence of the state. The mechanism of the non-canonical appointment of Theodoret to the metropolis by the Bulgarian (Tyrnovo) patriarch is revealed. It is concluded that this attempt was not successful due to a certain set of circumstances (the initiation of the issue even before the death of the current Metropolitan Theognost, the use of a non-canonical procedure for appointing him to the metropolis, opposition from the Moscow Duchy).

**Keywords**: Kiev Metropoly, Theodoret, Olgerd, Theognost, Patriarchate of Constantinople, Grand Duchy of Lithuania, Orthodox Church.

**For citation**: Lukashevich A. M. The struggle of the Grand Duchy of Lithuania for the Kyiv metropoly: the non-canonical metropolitan Theodorit (1352–1354). *Proceedings of BSTU, issue 6, History, Philosophy*, 2023, no. 2 (275), pp. 5–11. DOI: 10.52065/2520-6885-2023-275-2-1 (In Belarusian).

**Уводзіны**. У сучаснай айчыннай гістарыяграфіі назіраецца пэўная цікавасць да рэлігійнай гісторыі XIV ст. Адным з ключавых аспектаў гэтага перыяду з’яўляецца пытанне аб дасягненні Вялікім Княствам Літоўскім (ВКЛ) самастойнасці ў рэлігійным жыцці і арганізацыі царквы. Гэтыя

аспекты закраналі С. А. Падокшын [1], А. Я. Голубеў [2], С. А. Чаропка [3] і некаторыя іншыя даследчыкі [4]. Пераважна яны канцэнтравалі сваю ўвагу на стварэнні (аднаўленні) асобнай мітраполіі «Літвы» (Літоўскай мітраполіі).

У той жа час альтэрнатыўным варыянтам вырашэння пытання з'яўлялася пастаўленне на чале Кіеўскай мітраполіі (Кіеўскай і ўсяе Русі) кандыдатуры ад ВКЛ. Таму ў дадзеным артыкуле спынімся на разглядзе першай падобнай спробы, якую ў 1352 г. здзейсніў вялікі князь літоўскі Альгерд (1345–1377, кіраваў дзяржавай ва ўмовах дуўмвірату з братам Кейстутам).

Мэта артыкула – выявіць асаблівасці палітыка-царкоўнага становішча ва Усходняй Еўропе, якія абумовілі пастаўленне Феадарыта ў Тырнаве на чале Кіеўскай мітраполіі, раскрыць механізм і прааналізаваць законнасць гэтага дзеяння.

**Асноўная частка.** ***Расклад сіл.*** Вырашэнне пытання аб пастаўленні ў XIV ст. на чале Кіеўскай мітраполіі кандыдатуры ад ВКЛ ці княстваў Паўночна-Усходняй Русі (Маскоўскага, Цвярскога ці Ніжагародска-Суздальскага) залежала не толькі ад раскладу палітычных сіл паміж гэтымі цэнтрамі, але і ад сітуацыі ў Канстанцінопале.

Палітычныя змены, якія адбыліся ў 1347 г. у Візантыі (прыход да ўлады імператара Іаана VI Кантакузіна, 1347–1354), абумовілі карэкціроўку курсу Канстанцінопаля адносна «Рускай мітраполіі». Яе вынікам стала афіцыйнае закрыццё ў жніўні 1347 г. Галіцкай мітраполіі (1303–1305, 1341–1347), у склад якой уваходзілі сучасныя ўкраінскія, беларускія і польскія землі.

Рашэнне імператара Іаана VI Кантакузіна і канстанцінопальскага патрыярха Ісідара I (Вухіраса, 1347–1350) выклікала незадавальненне з боку Гедымінавічаў – Любарта (у хрышчэнні – Дзмітрый), фактычнага кіраўніка Галіцка-Валынскай дзяржавы (1323–1383), і яго братоў – Альгерда і Кейстута. Але ў 1347–1352 гг. яны не здолелі актыўна адрэагаваць на рашэнні Канстанцінопаля.

Гэта было абумоўлена новым этапам барацьбы за спадчыну Галіцка-Валынскага дзяржавы. У 1349 г. Галіцкая Русь, Валынь (разам з г. Уладзімірам), Белз, Падляшша і г. Берасце перайшлі пад уладу польскага караля Казіміра III, а Падолле стала яго васальнай зямлёй. За Любартам захаваўся толькі Луцкі ўдзел. Але ў 1350 г. войскі ВКЛ адбілі Белз, Берасце, Валынскую зямлю і далучылі іх да сваёй дзяржавы.

У 1351–1352 гг. ваенныя дзеянні за Галіцка-Валынскую Русь працягваліся з пераменным поспехам (Казімір III дзейнічаў у саюзе з венгерскім каралём Людовікам I). І толькі ў 1352 г. яны скончыліся перамір'ем. Казімір III атрымаў Львоўскую зямлю, а Гедымінавічы – Луцкую, Уладзімірскую, Холмскую і Берасцейскую землі. Крамянец часова, на два гады, аддаваўся ва ўладанне Юрыю Нарымунтавічу [4, с. 239–241, 244–248].

Акрамя барацьбы з Польшчай, ВКЛ з пераменным поспехам змагалася з крыжакамі, і ў лютым 1348 г. пацярпела паражэнне ў бітве каля р. Стрэве (правы прыток Нёмана) у Аўкштоце. Але ў 1349–1352 гг. Тэўтонскі ордэн перапыніў напады на ВКЛ з-за эпідэміі чумы [4, с. 192, 234–235].

У гэты ж час абвастрылася барацьба паміж Альгердам і вялікім князем уладзімірскім і князем маскоўскім Сямёнам Іванавічам Ганарлівым (1340–1353), які распачаў паход на Смаленск. Не маючы магчымасці змагацца на два франты, у 1349 г. Альгерд заключыў мірнае пагадненне з Маскоўскім княствам. Згодна з ім Смаленск і Бранск (з 1340 г. знаходзіўся ў залежнасці ад Смаленска, а праз яго – ад ВКЛ) увайшлі ў зону ўплыву Сямёна Ганарлівага [4, с. 213, 248]. У гэтых умовах Альгерд быў не зацікаўлены ў тым, каб праваслаўнае духавенства ВКЛ падпарадкоўвалася мітрапаліту, які з 1325 г. знаходзіўся ў Маскве.

Пры вырашэнні царкоўнага пытання ў Альгерда існавалі два варыянты: аднавіць незалежную ад Масквы мітраполію «Літвы» (план мінімум) або паставіць на чале мітраполіі Кіеўскай і ўсяе Русі свайго кандыдата і дабіцца вяртання кафедры з Уладзіміра на Клязьме ў Кіеў (план максімум). Выбар таго ці іншага варыянта залежаў ад збегу абставін.

Першы варыянт выглядаў больш лёгкім, паколькі з 1330 г. мітраполія «Літвы», па аргументаваным меркаванні П. П. Сакалова, знаходзілася ў статусе «незамешчанай» [5, с. 271]. Тым не менш у 1352 г. Альгерд паспрабаваў ажыццявіць больш шырокі план. Дзеля гэтага была выкарастана постаць інока (манаха) Феадарыта.

Улічваючы цяжкі стан здароўя мітрапаліта кіеўскага і ўсяе Русі Феагноста (1328–1353) [6, с. 371], Феадарыт прапанаваў Альгерду падтрымаць яго кандыдатуру. Зацікаўлены ў выбары мітрапалітам лаяльнага да Вільні іерарха, вялікі князь падтрымаў Феадарыта з патрабаваннем пры пастаўленні пасяліцца ў межах ВКЛ (паводле слоў І. Мэендорфа), ён «заахвочваў» таго «дамагацца хаця б тытула мітрапаліта Літоўскага») [7].

***Місіі Феадарыта ў Канстанцінопаль і Тырнава.*** Пасля атрымання ад Альгерда грамат Феадарыт у 1352 г. накіраваўся ў Канстанцінопаль [8, слп. 61]. У сталіцы Візантыі ён паведаміў пра смерць мітрапаліта Феагноста і прапанаваў сваю кандытару на мітрапаліцкую пасаду. Але пастаўленне не магло здзейсніцца пры жыцці іншага іерарха. Таму новы канстанцінопальскі патрыярх *Каліст I* (1350–1353, 1355–1363) адмовіўся зацвердзіць Феадарыта да таго часу, пакуль не будзе

атрымана пацвярджэнне аб смерці кіеўскага мітрапаліта.

Разумеючы непазбежнае фіяска, калі будзе атрымана інфармацыя з Масквы, Феадарыт пакінуў Канстанцінопаль і накіраваўся ў Тырнава (Балгарыя) да праціўнікаў Іаана VI Кантакузіна. Паводле версіі І. А. Чыстовіча, не падмацаванай крыніцамі, Феадарыт адправіўся ў Тырнава «ад імя паўднёва-рускіх князёў» і прасіў балгарскага патрыярха «аб пасвячэнні яго ў рускія мітрапаліты» [9, с. 109].

У 1352 г. на Балканах перамагла кааліцыя, якая падтрымлівала імператара Іаана V Палеолага (1341–1376, 1379–1390, 1391). Апошні, заручыўшыся падтрымкай сербаў і балгар, выступіў супраць цесця. Канфлікт паміж Іаанам VI Кантакузінам і двума славянскімі царствамі на Балканах меў наступствы і ў царкоўным плане. Скарыстаўшыся грамадзянскай і рэлігійнай смутай у Візантыі, сербскі цар Стэфан Душан (1346–1355) яшчэ ў 1346 г. абвясціў на саборы ў Скопле (Скоп'е) Сербскі патрыярхат. Гэта было зроблена насуперак Візантыі, з ухвалы балгарскага (тырнаўскага) патрыярха і аўтакефальнага архіепіскапа ахрыдскага. У сваю чаргу, сусветны патрыярх адрэагаваў у 1352 г. адлучэннем сербскай царквы. Хаця звестак пра афіцыйны кананічны разрыў паміж Канстанцінопалем і Тырнава не захавалася, у 1355 г. Каліст І скардзіўся на незалежны дух балгарскай царквы і на тое, што «балгарскі патрыярх спыніў памінаць за літургіяй свайго канстанцінопальскага сабрата» [7].

Таму не дзіўна, што адрынуты Візантыяй Феадарыт, быў рукапакладзены на чале Кіеўскай мітраполіі тырнаўскім патрыярхам Феадосіем ІІ (у 1355 г. Каліст І асудзіў яго за гэта) [10, с. 93; 11, слп. 62].

Дамоўленасць ВКЛ і Балгарыі, а магчыма, і Сербіі, магла мець для Візантыі разбуральныя наступствы. Паводле слоў І. Мэендорфа, яны маглі прывесці «аж да аддзялення рускай мітраполіі ад Канстанцінопальскага патрыярхата», паколькі Альгерд «меў намер устанавіць аўтакефальную царкву» [7]. Зразумела, што кананічная залежнасць «Рускай царквы» ад Тырнаўскага патрыярхату наўрад ці была б пастаяннай, але гэта быў балючы ўдар для збяднелай і падзеленай Візантыі.

На жаль, крыніцы не захавалі звестак пра дакладны тытул Феадарыта. Таму даследчыкі выказваюць розныя гіпотэзы. У сучаснай гістарыяграфіі дамінуе меркаванне, што Феадарыт быў пастаўлены на чале не Кіеўскай, а «Літоўскай» мітраполіі. Прычым гэта версія сустракаецца ў розных варыянтах.

Так, на думку Б. М. Флоры, паколькі «юрысдыкцыя» Феадарыта «распаўсюджвалася на землі, якія падпарадкоўваліся ўладзе Альгерда», то «фактычна была адноўлена Літоўская мітраполія» [12]. Прыкладна такога ж погляду прытрымліваецца і А. Я. Голубеў. На яго думку, Альгерд накіраваў у Канстанцінопаль Феадарыта «для пасвячэння на літоўскую кафедру» [2, с. 13]. У сваю чаргу А. Я. Мусін, без спасылак на крыніцы, называе Феадарыта мітрапалітам «Малай Русі» [13, с. 161]. Верагодна, ён паўтарае памылковую версію І. А. Чыстовіча пра тое, што Феадарыт быў пастаўлены «ў мітрапаліты для Паўднёвай Русі» [9, с. 109].

Між тым найбольш слушную думку выказаў французска-канадскі гісторык І. Мэендорф. Ён лічыў, што паколькі Феадарыт прэтэндаваў на тытул мітрапаліта кіеўскага і ўсяе Русі, то, верагодна, яго і атрымаў [7].

У той жа час Нікандр Д. Ціхаміраў і І. А. Чыстовіч звярталі ўвагу на тое, што пастаўленне на чале Кіеўскай мітраполіі Феадарыта ў Тырнаве, а не ў Канстанцінопале было некананічным. Таму яно з'яўлялася ўмяшальніцтвам балгарскага патрыярха ў справы канстанцінопальскага [10, с. 94; 9, с. 109].

***Дзейнасць Феадарыта ў якасці мітрапаліта.*** Пасля вяртання на Русь Феадарыт на працягу двух гадоў (да лета 1354 г.) кіраваў царквой на землях ВКЛ. У якасці месцазнаходжання ён абраў першастольны Кіеў, хаця той да 1362 г. яшчэ знаходзіўся па-за межамі ВКЛ і быў фармальна падпарадкаваны Ардзе.

Мітрапаліт Феадарыт патрабаваў ад епіскапаў падпарадкавання, але сустрэў супраціўленне. Як адзначаецца ў «Рагожскім летапісцы», у 1352 г. прыйшоў «чарнец... і стаў на мітраполлю ў Тырнове, і не прыяша яго Кіяне» [8, слп. 61]. Нягледзячы на тое, што ў летапісы чарнец названы Раманам, гаворка ідзе пра Феадарыта, супраць якога, хоць і не адразу, выступілі кіяўляне.

Гісторык Ціхаміраў Н. Д. адзначаў, што пасля некаторага знаходжання ў Кіеве Феадарыт «быў усімі адрынуты» як незаконны ўзурпатар мітрапаліцкай кафедры [10, с. 94]. У той жа час І. Мэендорф, лічыў, што Феадарыту падпарадкоўвалася «важная з гістарычнага пункту гледжання Кіеўская епархія» [7]. У любым выпадку, гісторыкі пагаджаліся, што без пэўнай падтрымкі Альгерда Феадарыт наўрад ці мог бы пратрымацца ў Кіеве два гады [10, с. 94].

Ёсць падставы лічыць, што Феадарыт спрабаваў падпарадкаваць сабе епіскапаў не толькі ў межах ВКЛ, але і тых зямель, якія знаходзіліся пад палітычным уплывам княства. Некаторыя даследчыкі лічаць (С. А. Чаропка), што «Феадарыта прызнаваў ноўгарадскі архіепіскап Майсей» [3, с. 19]. Такую ж думку выказвае і А. К. Краўцэвіч. Паводле яго слоў, у 1352 г. «мітрапаліт Феадарыт прыбыў у Кіеў, і яго прызнаў Вялікі

Ноўгарад» [4, с. 248]. Але гэта беспадстаўныя заявы [гл.: 14, р. 347–351; 11, слп. 52–64].

Больш асцярожна на гэты конт выказваўся А. Я. Мусін, які адзначаў, што Феадарыт «спрабаваў уступіць у царкоўныя зносіны з Ноўгарадам, аднак падрабязнасці гэтых адносін застаюцца нам невядомыя» [13, с. 163]. У сваю чаргу, І. Мэендорф лічыў, што архіепіскап ноўгарадскі Майсей «завагаўся ў сваёй вернасці састарэламу мітрапаліту Феагносту» [7]. Верагодна, на пазіцыю архіепіскапа Майсея (1325–1330, 1352–1359) паўплывалі напружаныя адносіны з Феагностам, інакш, Феадарыт наўрад ці спрабаваў бы дабіцца ад яго прызнання сваёй улады.

Калі пра ваганні Майсея даведаліся ў Канстанцінопале, патрыярх у афіцыйных пасланнях ад 2 ліпеня 1354 г. запатрабаваў ад архірэя падпарадкоўвацца толькі што пастаўленаму мітрапаліту кіеўскаму і ўсяе Русі Алексію (1354–1378). У адваротным выпадку, калі Майсей падтрымае Феадарыта, патрыярх пагражаў адлучэннем ад царквы [14, р. 347–351; 11, слп. 52–64].

***Прызначэнне мітрапалітам кіеўскім і ўсяе Русі Алексія.*** Яшчэ 6 снежня 1352 г. мітрапаліт Феагност узвёў у епіскапы ўладзімірскія Алексія – рускага манаха з баярскага роду, які з 1350 г. выконваў абавязкі мітрапаліцкага намесніка ў Маскве. Паколькі Уладзімір на Клязьме з'яўляўся стольным горадам вялікага княжання і адначасова рэзідэнцыяй мітрапаліта, то з пачатку XIV ст. тут асобны епіскап не прызначаўся; уладзімірскім епіскапам быў сам мітрапаліт. Такім чынам, прызначэнне Алексія мела на ўвазе, што ён з'яўляецца кандыдатам на замяшчэнне кіеўскай мітрапаліцкай кафедры пасля Феагноста.

У 1353 г. ад Сямёна Ганарлівага і Феагноста ў Канстанцінопаль былі адпраўлены паслы, каб хадайнічаць аб зацвярджэнні Алексія пераемнікам мітрапаліта. Вестка пра тое, што мітрапаліт Феагност яшчэ жывы (пра адваротнае паведамляў Феадарыт), выклікала ў патрыярха абурэнне. І таму на просьбу з Масквы быў атрыманы станоўчы адказ. Калі пасольства вярнулася, Феагност памёр (11 сакавіка 1353 г.). Таму Алексій неадкладна адправіўся ў Канстанцінопаль [6, с. 373–374]. У Візантыі ён быў вымушаны чакаць цэлы год.

Тым часам у Канстанцінопалі адбыліся чарговыя палітычныя змены. Пасля зняцця ў жніўні 1353 г. Каліста І (ён адмовіўся каранаваць Мацвея, сына Іаана VI Кантакузіна), па ўказанні імператара Сінод абраў патрыярхам Філафея (Кокіна, 1353–1354, 1364–1376). І той у лютым 1354 г. каранаваў Мацвея Кантакузіна суправіцелем бацькі. Разам з Іаанам VI Кантакузінам новы патрыярх імкнуўся захоўваць адзінства «Рускай мітраполіі».

У чэрвені 1354 г. у Канстанцінопале адбыўся патрыяршы Сінод, на якім мітрапалітам кіеўскім і ўсея Русі быў пастаўлены Алексій [14, р. 336–340; 11, слп. 42–52]. Адначасова Сінод пазбавіў мітрапаліта Феадарыта архіерэйскага сану і адлучыў яго ад царквы, пра што апавясцілі рускіх іерархаў [10, с. 94; 11, стб. 61–62].

На думку Н. Д. Ціхамірава, зацвярджэнне мітрапалітам прадстаўніка маскоўскага баярства было спробай патрыярха захавахаць свой кантроль над ўсёй Кіеўскай мітраполіяй [10, с. 94]. Больш за тое, Алексій быў пастаўлены ў мітрапаліты кіеўскія і ўсяе Русі са згоды Залатой Арды, пра гэта Філафей дамовіўся праз епіскапа сарайскага [11, слп. 53–54].

Спрыяльнае для Маскоўскага княства становішча было выкарастана Алексіем для таго, каб дамагчыся афіцыяльнага ўхвалення пераносу рэзідэнцыі мітрапаліта з Кіева ва Уладзімір на Клязьме. І хаця гэта ўжо выглядала «анахранізмам» (мітрапаліт жыў ва Уладзіміры з 1299 па 1325 г., пасля гэтага пераехаў у Маскву), патрыярх фармальна пагадзіўся з пераносам сталіцы мітраполіі. З 1354 г. Уладзімір на Клязьме стаў другой кафедрай кіеўскіх мітрапалітаў, але за Кіевам захаваўся статус «першага мітрапаліцкага стала » [14, р. 336–340; 11, слп. 64–70].

Змена месца жыхарства мітрапаліта абгрунтоўвалася пытаннямі бяспекі (спустошаны Кіеў не меў ні прэстыжу, ні сродкаў, каб утрымліваць іерарха). Але сапраўдным матывам пераносу, як слушна адзначаў А. Мірановіч, быў рост прэстыжнасці Маскоўскага княства [15, с. 8]. Верагодна, на рашэнне патрыярха паўплывала і прысутнасць у Кіеве Феадарыта. Сваім актам патрыярх сведчыў, што знаходжанне таго ў Кіеве не дае яму законных правоў, бо горад больш не з'яўляецца мітрапаліцкай кафедрай.

Рашэнне патрыяршага Сінода было спробай штучна падтрымаць адзінства колішняй Кіеўскай мітраполіі. Паводле слушнага меркавання А. Мірановіча, ухваленне пераносу кафедры з Кіева ва Уладзімір на Клязьме было «накіравана супраць Літвы, а ў далейшай перспектыве – супраць Польшчы». І яно пацвярджала, «што патрыярх не ўяўляў сабе на рускіх землях іншага праваслаўя, чым маскоўскае», а ў Сінодзе «дамінавала дактрына, што Праваслаўную царкву можа курыраваць толькі артадаксальны манарх» [15, с. 8–9] .

Што тычыцца Феадарыта, то пасля лета 1354 г. пра яго ў крыніцах больш не згадваецца. Пазбаўлены сану і адлучаны ад царквы, ён згубіў падтрымку з боку Альгерда. Несумненна, што вялікі князь, зыходзячы з інтарэсаў сваёй дзяржавы, імкнуўся мець асобнага мітрапаліта. Але пасля таго, як Феадарыт быў зрынуты канстанцінопальскім патрыярхам, Альгерд палічыў не патрэбным заступацца за чалавека, бескарыснага ў далейшых планах.

**Заключэнне**. Такім чынам, у сярэдзіне XIV ст. лёс Кіеўскай мітраполіі знаходзіўся ў прамой залежнасці не толькі ад раскладу палітычных сіл паміж рознымі цэнтрамі Русі, але і ад развіцця падзей у Візантыі. Працяглае супрацьстаянне ў 1340–1350-я гг. двух імператараў – Іаана V Палеолага і Іаана VI Кантакузіна ўскладнялася агульным згасаннем дзяржавы. Нетрываласць пазіцый канстанцінопальскага патрыярха, які цалкам залежаў ад палітычнай кан'юнктуры, абумовіла іх частую змену (Ісідар І, Каліст І, Філафей). Гэта яшчэ больш ускладняла пытанне з «Рускай мітраполіяй».

Паступовае паглынанне Галіцка-Валынскай дзяржавы больш моцнымі суседзямі – Польскім Каралеўствам і Вялікім Княствам Літоўскім, вылучалі на парадак дня пытанне пра царкоўную самастойнасць заходняй часткі Русі. Вялікі князь літоўскі Альгерд не жадаў, каб епіскапы ў межах яго дзяржавы падпарадкоўваліся мітрапаліту, які сядзеў у Маскве. У гэтых умовах для ВКЛ існавалі два варянты вырашэння пытаня: дабівацца стварэння асобнай мітраполіі «Літвы» (праграма мінімум) або імкнуцца да пастаўлення на агульную мітраполію свайго кандыдата з вяртаннем кафедры ў Кіеў (праграма максімум). Апошні варыянт даваў больш шансаў для паспяховага вырашэння палітычнай задачы па збіранні зямель Русі вакол ВКЛ.

Першапачаткова Альгерд паспрабаваў рэалізаваць больш шырокі план, і ў 1352 г. падтрымаў кандыдатуру Феадарыта на пасаду мітрапаліта кіеўскага і ўсяе Русі. Але гэтая спроба аказалася няўдалай з-за пэўнага збегу абставін. Ініцыяцыя пытання яшчэ да смерці дзейснага мітрапаліта Феагноста, неканaнічны парадак пастаўлення Феадарыта (тырнаўскім, а не канстанцінопальскім патрыярхам), моцнае процідзеянне з боку Маскоўскага княства, – усё гэта абумовіла непрызнанне новага мітрапаліта на Русі і адлучэнне яго ад царквы. Таму Альгерд адмовіўся ад далейшай барацьбы за Феадарыта.

Між тым дзеянні ВКЛ сведчылі пра новую тэндэнцыю ў Еўропе – спробу стварэння ў межах нацыянальных дзяржаў царкоўных аўтакефалій. Улічваючы сепаратызм балканскіх славян (Балгарыя, Сербія), якія абвясцілі стварэнне ўласных патрыярхатаў, у Візантыі ў дзейнасці Альгерда і Феадарыта ўбачылі спробу арганізаваць новую агульнарускую мітраполію з цэнтрам ў Кіеве. Гэта пагражала «візантыйскай садружнасці» ва Усходняй Еўропе, на змену якой вылучалася поліцэнтрычная сістэма, адкрытая заходняму ўплыву.

Таму дзеля захавання адзінства «Рускай мітраполіі» ў чэрвені 1354 г. канстанцінопальскі патрыярх пагадзіўся на пастаўленне мітрапалітам не ўласнага кандыдата (грэка), а прадстаўніка баярскіх колаў Маскоўскага княства (Алексія). Адначасова быў ухвалены перанос мітрапаліцкай кафедры з Кіева ва Уладзімір на Клязьме. Усё гэта сведчыла пра пэўныя саступкі Маскве, у выніку якіх новы мітрапаліт кіеўскі і ўсяе Русі меў большы ўплыў і аўтарытэт, чым яго папярэднікі.

**Спіс літаратуры**


1. Падокшын С. А. Унія. Дзяржаўнасць. Культура: філасофска-гістарычны аналіз. Мінск: Беларуская навука, 1998. 111 с.
2. Голубев О. Е. Великое княжество Литовское и Константинопольский патриархат: становление и развитие церковно-политических взаимоотношений (1316–1387 гг.): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.03. Минск: БГУ, 2013. 24 с.
3. Черепко С. А. Православная церковь на Руси XIII–XV веков: борьба за митрополию // Беларусь і суседзі: шляхі фарміравання дзяржаўнасці, міжнацыянальныя і міждзяржаўныя адносіны: зб. навук. арт. Вып. 4. Гомель: УА «ГДУ імя Ф. Скарыны», 2015. С. 14–27.
4. Краўцэвіч А. Гісторыя Вялікага Княства Літоўскага (1248–1377): у 2 кн. Гародня: А. Краўцэвіч; Wrocław: Kolegium Europy Wschodniej im. Jana Nowaka-Jeziorańskiego we Wrocławiu, 2015. Кн. 1–2. 304 с.
5. Соколов П. Русский архиерей из Византии и право его назначения до начала XV века. Киев: Тип. И. И. Чоколова, 1913. [2], IV. 578 с.
6. Приселков М. Д. Троицкая летопись: Реконструкция текста. М.; Л.: Изд. и 1-я тип. Изд-ва Акад. наук СССР в Л., 1950. 515 с.
7. Мейендорф И. Ф. Византия и Московская Русь: очерк по истории церковных и культурных связей в XIV в. Paris: YMCA-press, 1990. 442 с. // Седмица.RU. Церковно-научный центр «Православная Энциклопедия». URL: https://www.sedmitza.ru/lib/text/438192/ (дата звароту: 10.06.2023).
8. Полное собрание русских летописей, изданное по высочайшему повелению Археографической коммиссиею. Т. XV. Рогожский летописец, вып. 1. Пг.: Изд. Археограф. комис., 1922. XVIII с., 186 стб.
9. Чистович И. А. Очерк истории западно-русской церкви. В 2 ч. Ч. 1. СПб.: Тип. Деп. уделов, 1882. [6]. 221 с.

10. Тихомиров Н. Д. Галицкая митрополия: церковно-историческое исследование. СПб.: Печ. Е. Евдокимова, 1895. 189 с.

11. Памятники древнерусского канонического права: Ч. 1. Памятники XI–XV вв. / ред. А. С. Павлов. СПб.: Тип. Имп. Акад. наук, 1880. IV с., XX, 930, 70 стб. (Рус. ист. б-ка, изданная Импер. Археограф. комиссией; т. 6).

12. Флоря Б. Н. Литовская митрополия // Православная энциклопедия. URL: https://www.pravenc.ru/text/2110579.html (дата звароту: 10.06.2023).

13. Мусин А. Е. Загадки дома Святой Софии: Церковь Великого Новгорода в X–XVI вв. СПб.: Петербургское Востоковедение, 2016. 240 с., ил. (Slavica Petropolitana).

14. Miklosich F., Müller I. Acta patriarchatus Constantinopolitani MCCCXV–MCCCCII e codicibus manu scriptis bibliothecae Palatinae vindobonensis: in 2 vol. Wien, 1975. Vol. 1. 607 p.

15. Міранові А. Палітыка Канстанцінопальскага патрыярхату да Кіеўскай мітраполіі ў 988–1686 гадах // Białoruskie Zeszyty Historyczne = Беларускі гістарычны зборнік. 2008. № 30. С. 5–25.

## References

1. Padokshyn S. A. *Uniya. Dzyarzhaunasts’. Kul'tura: filasofska-gistarychny analiz* [Union. Statehood. Culture: Philosophical and historical analysis]. Minsk, Belaruskaya navuka Publ., 1998. 111 p. (In Belarusian).

2. Golubev O. E. *Velikoye knyazhestvo Litovskoye i Konstantinopol'skiy patriarkhat: stanovleniye i razvitiye tserkovno-politicheskikh vzaimootnosheniy (1316–1387 gg.). Avtoreferat dissertatsii kandidata istoricheskih nauk* [The Grand Duchy of Lithuania and the Patriarchate of Constantinople: the formation and development of church-political relations (1316–1387). Abstract of the dissertation PhD (History)]. Minsk, Belorus. gos. un-t Publ., 2013. 24 p. (In Russian).

3. Cherepko S. A. The Orthodox Church in Rus' in the XIII–XV centuries: the struggle for the metropolis. *Belarus' i susedzi: shlyakhi farmiravannya dzyarzhaunastsi, mizhnatsyyanal'nyya i mizhdzyarzhaunyya adnosiny: zbornik navuk. artykulau* [Belarus and its neighbors: ways of becoming a state, international and interstate relations: coll. articles], issue 4. Gomel', UA “GDU imya F. Skaryny” Publ., 2015, pp. 14–27 (In Russian).

4. Krautsevich A. *Gistoryya Vyalikaga Knyastva Litouskaga (1248–1377)*: u 2 kn. [History of the Grand Duchy of Lithuania (1248–1377): in 2 books]. Garodnya, A. Krautsevich Publ.; Wroclaw, Kolegium Europy Wschodniej im. Jana Nowaka-Jeziorańskiego we Wrocławiu Publ., 2015. Books 1–2. 304 p. (In Belarusian).

5. Sokolov P. *Russkiy arkhierey iz Vizantii i pravo ego naznacheniya do nachala XV veka* [Russian bishop from Byzantium and the right of his appointment until the beginning of the 15th century]. Kyiv, Tip. I. I. Chokolova Publ., 1913. [2], IV, 578 p. (In Russian).

6. Priselkov M. D. *Troitskaya letopis': Rekonstruktsiya teksta* [Trinity Chronicle: Reconstruction of the text]. Moscow; Leningrad, Izd. i 1-ya tip. Izd-va Akad. nauk SSSR v L. Publ., 1950. 515 p. (In Russian).

7. Meyendorf I. F. *Vizantiya i Moskovskaya Rus': ocherk po istorii tserkovnykh i kul'turnykh svyazey v XIV v.* [Byzantium and Muscovite Rus': Essay on the history of church and cultural relations in the XIV century]. Paris, YMCA-press, 1990. 442 p. Available at: https://www.sedmitza.ru/lib/text/438192/ (accessed 06/10/2023) (In Russian).

8. *Polnoye sobraniye russkikh letopisey, izdannoye po vysochayshemu poveleniyu Arkheograficheskoy komissiyey. T. XV. Rogozhskiy letopisets, vyp. 1* [Complete collection of Russian chronicles, published by the highest order of the Archaeographic Commission. Vol. XV. Rogozhsky chronicler, issue 1]. Petrograd, Izd. Arheograf. komis. Publ., 1922. XVIII p., 186 column (In Russian).

9. Chistovich I. A. *Ocherk istorii zapadno-russkoy tserkvi*: v 2 ch. [Essay on the history of the Western Russian Church: in 2 parts]. St. Petersburg, Tip. Dep. Udelov Publ., 1882, part 1. [6]. 221 p. (In Russian).

10. Tihomirov N. D. *Galitskaya mitropoliya: tserkovno-istoricheskoye issledovaniye* [Galician Metropolis: church-historical research]. St. Petersburg, Pech. E. Evdokimova Publ., 1895. 189 p. (In Russian).

11. Pavlov A. S. (edit). *Pamyatniki drevnerusskogo kanonicheskogo prava. Ch. 1. Pamyatniki XI–XV vv.* [Monuments of Old Russian Canon Law. Part 1. Monuments of the XI–XV centuries]. St. Petersburg, Tip. Imp. Akad. Nauk Publ., 1880. IV p., XX, 930, 70 column. (In Russian).

12. Florya B. N. Lithuanian Metropolis. *Pravoslavnaya entsiklopediya* [Orthodox Encyclopedia]. Available at: https://www.pravenc.ru/text/2110579.html (accessed 07/10/2023) (In Russian).

13. Musin A. E. *Zagadki doma Svyatoy Sofii: Tserkov' Velikogo Novgoroda v X–XVI vv.* [Riddles of the house of Hagia Sophia: the Church of Veliky Novgorod in the X–XVI centuries]. St. Petersburg, Peterburgskoye Vostokovedeniye Publ., 2016. 240 p. (In Russian).

14. Miklosich F., Müller I. Acta patriarchatus Constantinopolitani MCCCXV–MCCCCII e codicibus manu scriptis bibliothecae Palatinae vindobonensis. In 2 vol. Wien, 1975, vol. 1. 607 p. (In Latin, Greek).

15. Miranovich A. Policy of the Patriarchate of Constantinople towards the Kievan Metropolis in 988–1686. *Białoruskiye Zeszyty Historyczne = Belaruski gistarychny zbornik* [Belarusian historical notebooks = Belarusian historical collection], 2008, no. 30, pp. 5–25 (In Belarusian).

**Інфармацыя пра аўтара**

**Лукашэвіч Андрэй Міхайлавіч** – доктар гістарычных навук, прафесар, прафесар кафедры гісторыі Беларусі новага і навейшага часу. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (220030, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 4, Рэспубліка Беларусь). E-mail: lukashevand@mail.ru

**Information about the author**

**Lukashevich Andrei Mikhailovich** – DSc (History), Professor, Professor, the Department of history of Belarus of new and contemporary times. Belarusian State University (4, Nezavisimosti Ave., 220030, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: lukashevand@mail.ru

*Паступіў 03.09.2023*